Яшчэ адным яскравым прыкладам з'яўляецца Спаса-Праабражэнская царква ў Магілёве (перабудова 1740-1762 гг.), які меў нетрадыцыйную для праваслаўя трохнефавую небазілікальную крыжова-купальную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю з планам у выглядзе выцягнутага лацінскага крыжа і дзвюхвежавым фасадам-нартэксам. Рысы віленскага барока ў пластычнай распрацоўцы фасада выявіліся таксама ў вертыкалізме прапорцый пілястраў і прасценкаў, дэкаратыўных абрамленнях праёмаў.

І.К. Глаўбіц з'яўляецца аўтарам і касцёла Святога Юрыя ў Забелах-Валынцах (1749 г.). Тут ён амаль дакладна паўтарыў архітэктурныя формы сваіх больш ранніх віленскіх пабудоў: касцёлаў Святога Якуба, місіянераў і Беразвецкай царквы, толькі з улікам таго, што храм быў аднанефавы з франтонамі-"дыядэмамі" на галоўным фасадзе і над алтарнай апсідай.

Аўтарству І.К. Глаўбіца таксама належыць касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Мсціславе (пабудаваны ў 1614 г. рэканструяваны ў 1746-1750 гг.), касцёл у Лідзе (1747-1770 гг.) і, на думку некаторых даследчыкаў, касцёл у Быстрыцы (пабудаваны ў 1523 г. перабудаваны у 1760 г.). Іншы раз памылкова да творчасці І.К. Глаўбіца адносяць такі выдатны твор сакральнай архітэктуры, як новы фасад касцёла кармелітаў босых у Глыбокім (зараз Свята-Раства-Багародзіцкая царква), завершаны да 1735 г. У процівагу С. Лёранцу [2] некаторыя даследчыкі лічаць гэты помнік належным да творчасці архітэктара І. Фантана III, дзейнасць якога па часе некалькі апярэджвала дзейнасць Глаўбіца.

Такім чынам, архітэктурна-мастацкая плынь, якая праявілася ў дойлідстве архітэктара І.К. Глаўбіца ў XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі, найбольш характэрная для стылістыкі віленскага барока. Больш таго, І. Глаўбіца неабходна прызнаць калі не родапачынальнікам стылю віленскае барока, дык найбольш яскравым яго прадстаўніком.

Літаратура


1. Архітэктура Беларусі: Энцыкл. давед. / БелЭн. - Мн.: БелЭн, 1993;
2. Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. - Мн.: Ураджай, 2001.
3. Кулагин А.М. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии. - Мн.: Наука и техника, 1989.
4. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш. - Мн.: Полымя, 1998.


УДК 93(476)

**КОТ А. В.**

***Навуковы кіраўнік: Малыхіна Л.Ю.***

## БЕЛАРУСКАЯ КРАЁВАЯ АБАРОНА

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ апынуўся ў надзвычай складаным становішчы. Акупаваная да верасня 1941 г. нямецка-фашысцкімі войскамі тэрыторыя БССР увайшла ў склад новых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, у якіх не ўлічвалася этнічнае паходжанне - рэйсхкамісарыятаў Украіна, Усходняя Прусія, тылавы раён

групы армій "Цэнтр" і Остланд. У склад апошняга рэйсхкамісарыята і была ўключана генеральная акруга "Беларусь", якая складала не больш трэці даваеннай тэрыторыі БССР. Акруга была падзелена на гебітскамісары: Баранавіцкі, Барысаўскі, Вілейскі, Глыбоцкі, Лідскі, Мінскі, Навагрудскі, Слонімскі і Слуцкі. Менавіта тут прыхільнікі беларускай нацыянальнай ідэі выкарыстоўвалі савецка-германа-польскі канфлікт ва ўласных мэтах, першай з якіх было адраджэнне беларускай дзяржавы.

На чале генеральнай акругі "Беларусь" стаяў генеральны камісарыят, які ўзначальваў адзін з паплечнікаў Гітлера гаўляйтар Вільгельм фон Кубэ. Пасля забойства Кубэ мінскімі падпольшчыкамі 22 верасня 1943 г. яго месца заняў групенфюрэр войск СС Курт фон Готберг. Пры стварэнні фашысцкай акупацыйнай адміністрацыі і паліцэйскіх фарміраванняў немцы абапіраліся на падтрымку беларускіх нацыяналістаў. З розных краін Еўропы гітлераўцы прывозілі сваіх памагатых беларускага паходжання, некаторыя з якіх пачыналі кар'еру яшчэ ў перыяд БНР (1918-1920 гг.). Сярод іх былі Р. Астроўскі, В. Гандлеўскі, К. Езавітаў, І. Ермачэнка, В. Іваноўскі, У. Казлоўскі, Ф. Кушаль, Я. Станкевіч і інш. Іх дапоўнілі прыхільнікі БНР Ф. Акінчыц, М. Ганько, Ю. Сабалеўскі, В. Тумаш, М. Шкялёнак, А. Адамовіч, Н. Арсеньева, Ю. Віцьбіч, У. Гуцька, А. Калубовіч, Ф. Яроміч і інш. [1]. З дапамогай спецыяльна створаных школ, газет, часопісаў, радыё, кіно і іншых сродкаў агітацыі і прапаганды акупацыйныя ўлады імкнуліся прывіць насельніцтву Беларусі дух пакорнасці, паслушэнства. Гітлераўцы прымушалі мясцовае насельніцтва супрацоўнічаць з імі. Гэта з'ява ў 1953 г. атрымала назву калабарацыя (ад фр. coloboration - супрацоўніцтва). Па розных звестках на Беларусі сярод калабарантаў налічвалася каля 80-100 тысяч чалавек, многія з якіх былі прыцягнуты да супрацоўніцтва з акупантамі прымусова.

З мэтай развіць нацыянальную варожасць акупацыйныя ўлады стварылі нацыяналістычныя арганізацыі. Так, 22 кастрычніка 1941 г. была зарэгістравана Беларуская Народная Самапомач (БНС), якая дамагалася прызнання за сабой права на самакіраванне і рабіла спробы стварыць Беларускі Корпус Самаахова.

У сакавіку 1943 г. на з'ездзе Цэнтральнай Рады і акруговых кіраўнікоў БНС быў выпрацаваны мемарандум, які патрабаваў ад нямецкіх улад поўнай аўтаноміі Беларусі, стварэння беларускага ўрада і арміі. Пры гэтым у ім падкрэслівалася, што калі будзе створаны ўрад, то ён "абвесціць аддзяленне Беларусі ад СССР і аб'явіць яму вайну, як ворагу беларускага народа". Аднак гітлераўскае кіраўніцтва спачатку не дапускала нават і думкі аб стварэнні на захопленых тэрыторыях СССР дзяржаўных утварэнняў, таму па распараджэнню нямецкай адміністрацыі дзейнасць БНС была ўзята пад яшчэ больш жорсткі кантроль. 4 чэрвеня 1943 г. БНС была рэарганізавана ў Беларускую Самапомач, дзейнасць якой абмяжоўвалася зборам ахвяраванняў, аказаннем матэрыяльнай дапамогі, вярбоўкі новых членаў.

У снежні 1943 г. была створана Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР). Генеральны камісар Беларусі групенфюрэр СС Готберг у студзені 1944 г. зацвердзіў яе першы склад. Прэзідэнтам БЦР стаў Радаслаў Арлоўскі, які паспеў ужо да гэтага часу выявіць сваю адданасць гітлераўскаму рэйху на пасадах бургамістра Мінскай акругі, Смаленска, Бранска і Магілёва. Радаслаў Казіміравіч Астроўскі (1887-1976) у свой час прымаў удзел у рэвалюцыі 1905-1907 гг., быў студэнтам Пецярбурскага, Юр'еўскага універсітэтаў. Прыхільнік

БНР, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, Р. Астроўскі ўжо ў 1941 г. пераехаў у акупаваны Мінск [6, 224-225].

Упершыню гаворка пра стварэнне беларускай арміі пайшла на першым пасяджэнні БЦР 22 студзеня 1944 г., калі Р. Астроўскі ў сваёй дэкларацыі заявіў, што галоўнай мэтай Рады будзе аб'яднанне ўсіх беларускіх сіл для барацьбы з партызанскім рухам.

23 лютага 1944 г. начальнік сілаў СС і паліцыі, Генеральны камісар Курт фон Готберг выдае загад "Аб стварэнні Беларускай Краёвай Абароны" ад 18.02.1944 г. для барацьбы супраць бальшавізму. Утварэнне БКА праводзілася ў межах генеральнай акругі "Беларусь", за выключэннем некаторых тэрыторый. У першую чаргу мабілізавалі ўсіх былых афіцэраў ва ўзросце да 57 год і былых падафіцэраў ва ўзросце да 55 год, якія не знаходзіліся на кіруючых пасадах і не працавалі спецыялістамі ў нямецкіх установах. Мабілізацыя пачыналася праз 3 дні пасля заканчэння інструктажу афіцэраў і падафіцэраў і тычылася прызыўнікоў 1908-1917 і 1921-1924 гг. нараджэння. З кожнага раёну, паводле выдадзеных БЦР інструкцый, меркавалася прызваць каля 500 чалавек, аб якіх начальнік раёну складаў спіс з кароткай рэкамендацыяй аб палітычнай надзейнасці кожнай асобы. Перападрыхтоўку радавых пачыналі адразу ў раённым цэнтры пад кіраўніцтвам афіцэра- камандзіра і акруговага афіцэра.

Накіраваныя ў Мінск афіцэры і падафіцэры павінны былі прайсці трохтыднёвыя курсы перападрыхтоўкі. Яны атрымлівалі дакументы на выезд ад акруговага каменданта паліцыі, і перад ад'ездам у супраўаджэнні нямецкага праваднiка павінны былі прайсці санітарную апрацоўку. Вайсковую і тэхніка-зброявую падрыхтоўку праводзіў у іх СС-паліцайфюрэр Беларусі, палітычную - БЦР разам з капітанам Кмерам. Толькі пасля гэтага курсанты атрымлівалі зброю.

БЦР адразу ўзялася за правядзенне мабілізацыі. 25 лютага ў Мінску адбыўся вялікі мітынг, на якім капітан Чырвонай Арміі Ігар Капор "выкрывае" тайны загад Іосіфа Сталіна аб поўным вынішчэнні беларускага народа, пасля чаго была падрыхтавана рэзалюцыя аб гатоўнасці беларускага народа да барацьбы з бальшавізмам. У той самы дзень БЦР прызначыла сваіх акруговых камендантаў у Мінску, Баранавічах, Глыбокім, Навагрудку, Слоніме, Слуцку, Вілейцы. Ім загадвалася ўзначаліць справу прызыўных камісій ў сваіх акругах. У стварэнні БКА прымалі ўдзел амаль усе спецслужбы Германіі, пры неабходнасці ім садзейнічалі адміністрацыйныя улады і грамадцкія арганізацыі.

Адносна штабу БКА адразу пачаліся разнагалосіцы паміж БЦР і нямецкімі ўладамі. Немцы стаялі на тым, што адзіным абавязкам БЦР з'яўляецца правядзенне мабілізацыі, а кіраванне сабранымі людзьмі належыць да кампетэнцыі нямецкіх уладаў. БЦР, у сваю чаргу, выказвалася за тое, каб пасля мабілізацыі БЦР брала ўдзел у кіраўніцтве БКА пры дапамозе свайго асабістага штабу. Пад час доўгіх перамоў паміж Маркусам, палітычным рэферэнтам Генеральнага камісарыята Беларусі, і прэзідэнтам БЦР было пастаноўлена, што пры БЦР будзе ўтвораны аддзел БКА, які падрыхтуе мабілізацыю, правядзе яе і будзе супрацоўнічаць з штабам фон Готберга ў справах прапаганды, гаспадарчых, санітарных, і вайсковай падрыхтоўкі. Уся аперацыйная сфера належала толькі нямецкаму штабу фон Готберга. З Маркусам, таксама, было дагаворана, што фон Готберг прымае на сябе абавязак ўзброіць БКА. БЦР прымала на сябе справу абмундзіравання БКА.

У другой палове лютага 1944 г. ўсе пытанні адносна БКА галоўным штабам фон Готберга і БЦР былі ўзгоднены. Узначальвала БКА галоўнае камандаванне на чале з маёрам Ф. Кушалем, якому падпарадкоўваліся акружныя аддзелы арміі. Намеснікам Франса Кушаля стаў Віталь Мікула. Былі прызначаны акруговыя начальнікі БКА. Намеснікі БЦР і акруговыя начальнікі БКА адразу накіроўваліся на месцы, дзе пачалі мабілізацыю.

Згодна з успамінамі Ф. Кушаля [5, 16] ў кожным павеце праектавалася стварэнне батальёна да 600 чалавек. Мабілізацыю было паручана правесці 10 сакавіка 1944 г.

1 сакавіка на канферэнцыі ў Міністэрстве ўсходніх абшчараў Готберг прадставіў праект стварэння ў Беларусі на працягу 4-6 тыдняў антыпартызанскага фарміравання сілаю 20 тысяч чалавек. У яго павінны былі ўліцца казацкія, і каўказкія часці, брыгада Камінскага і беларускія батальёны. 6 сакавіка 1944 г. Р. Астроўскі падпісаў загад аб мабілізацыі ў БКА. Паводле яго загаду аб мабілізацыі, на прызыўныя пункты склікалі каля 40 тысяч мужчын. Да Краёвай Абароны было далучана і некалькі паліцэйскіх батальёнаў. На базе вайсковага аддзела БЦР паўстала вярхоўнае камандаванне БКА, якое часам называецца яе штабам. Нежаданне фон Готберга стварыць 40-тысячнае беларускае войска прывяло да таго, што акруговыя камісары забракавалі каля 50 % прызыўнікоў. Амаль палова прызваных была адсеяна, каб не сарваць, па меркаваннях Готберга, работу прадпрыемстваў.

Загад аб мабілізацыі з 7-10 сакавіка 1944 г. прадугледжваў, што не пазней чым праз 3 гадзіны пасля абвяшчэння загаду кожная асоба, падлягаючая прызыву, павінна накіравацца на зборны пункт у воласці, адкуль будзе накіравана ў павятовы цэнтр для медыцынскага агляду. З сабой неабходна было мець вопратку і абутак у добрым стане, 3 пары бялізны, прылады для ежы і мыцця, асабістыя рэчы. Па палажэнню загада "тыя, хто ў вызначаны час не з'явіцца на пункт збору, будуць лічыцца здраднікам і прыгавораны да смяротнага пакарання".

З ваеннага пункту гледжання мабілізацыя ў БКА вялася вельмі прафесыйна. І таму не дзіўна, што да 15 сакавіка ў шэрагі БКА ўлілося 19 тысяч чалавек. Пад канец таго ж месяца іх стала яшчэ больш, каля - 22 тысяч чалавек. Да БКА было далучана яшчэ і некалькі паліцэйскіх батальёнаў, што прывяло да таго, што асабовы склад да пачатку красавіка 1944 г. налічваў 24-25 тысяч чалавек. Вясной было сфарміравана 39 пяхотных і 6 сапёрных батальёнаў. Для супрацьдзеяння партызанскай разведцы 14 сакавіка 1944 г. Ф. Кушаль падпісаў падрабязную інструкцыю, якая прадугледжвала вялікую асцярожнасць пры правядзенні мабілізацыі, каб выключыць магчымыя правакацыі. У сваю чаргу партызаны паводзілі сябе па-рознаму. Так, у некаторых выпадках яны выстаўлялі пасты, перахоплівалі прызыўнікоў, не пускалі іх на прызыўныя пункты. У іншых месцах ім наадварот раілі браць зброю, каб потым павярнуць яе супраць немцаў. Найслабейшым звяном у БКА была слабасць афіцэрскага саставу, адсутнасць вайсковых структур, штатаў, праграм падрыхтоўкі. Да гэтага ж трэба дадаць адсутнасць вайсковых традыцый, належнага вайсковага вопыту, зброі, абмундзіравання. Готбэрг спрабаваў здабыць у Берліне 20 тысяч вінтовак для БКА, аднак іх не прыслалі і да сярэдзіны мая. Таму давялося абмежавацца зброяй з мясцовых складаў, на 6-7 чалавек выдалі па адной вінтоўцы.

Нягледзячы на меўшыеся праекты ўвядзення ў беларускіх вайсковых фарміраваннях уніформы, жаўнеры БКА так і не атрымалі стандартнай формы вопраткі - назіраўся факт аднaчасовага выкарыстання элементаў савецкай і нямецкай форм. 18 сакавіка 1944 г. у БКА была ўведзена какарда з "Пагоняй", чырвоныя пятліцы з белым Ярылавым крыжам і пагоны з чырвонымі лычкамі для ніжэйшых чыноў і срэбранымі зорачкамі для афіцэраў. У красавіку таго ж года была канчаткова зацверджана сістэма рангаў і знакі адрознення. Чырвоныя лычкі, зорачкі і галуны былі заменены на васількі і жоўтыя каласкі. У якасці нарукаўнага шчытка выкарыстоўваліся 2 узоры: з вертыкальнымі бела-чырвона-белымі стужкамі, жоўтым Ярылавым крыжам, чырвонай акантоўкай і надпісам зверху - WEISSRUTHENIEN; і белы шчыток з чырвонай стужкай пад нахілам у 45 % і надпісам - BIELORUSSKAIA. Намінальная назва "Беларусь" на нашыўках уніформы стала гульнёй на нацыянальных пачуццях дзеля дасягнення стратэгічных задач: папоўніць армію Вермахта за кошт насельніцтва заваяваных краін за пустыя абяцанні даравацъ у будучым суверэнітэт краю. Нашчадкі не зразумелі гэткі агідны шлях набыцця дзяржаўнасці. І ці была б яна? Нават калі мы і мелі справу з адзінкавымі выпадкамі шчырага патрыятызму сярод удзельнікаў БКА - ён не будзе ацэнены будучымі жыхарамі Рэспублікі Беларусь. І пры галасаванні на лістападаўскім рэферэндуме 1996 г. большасць з іх выкажацца за змяненне гістарычнай (з часоў ВКЛ!) сімволікі, паколькі ў памяці народнай яна з'яўляецца асацыяцыяй гітлераўскага рэжыму. Распрацаваны на аснове нацысцкай праект уніформы жаўнераў БКА так і не быў поўнасцю ўведзены ў жыццё. Гэта адлюстравала не толькі астаткавы прынцып размеркавання грашовых сродкаў на прафашысцкія вайсковыя фарміраванні. Набліжаўся фронт, акупанты адчувалі блізкую развязку не на сваю карысць.

Сапёрныя батальёны атрымалі нямецкую ўніформу і ўзбраенне. Па ўспамінах І. Касяка [7] і Я. Найдзюка [3] моладзь не хацела ісці ў іх, бо імкнулася служыць у баявых батальёнах БКА. Даведаўшыся пра слабасць узбраення ў БКА партызаны пачалі рабіць напады, пад час якіх беларускія батальёны, нягледзячы на адсутнасць зброі і гераізм, часта цярпелі паражэнні. Паступова дысцыпліна падала. Пад уплывам агітацыі партызан і падпольшчыкаў, баявых дзеянняў Чырвонай Арміі адбывалася масавае дзезерціpства вайскоўцаў БКА і пераход іх са зброяй да партызан.

25 сакавіка адбылася ўрачыстая прысяга БКА ў паасобных батальёнах. У Мінску на Кафедральнай Плошчы прысягу прымалі курсанты афіцэрскай і падафіцэрскай школ у прысутнасці прэзідэнта БЦР, Курта фон Готберга, прадстаўнікоў нямецкай арміі, цывільнай адміністрацыі і вялікага натоўпу народа. Прысяга мела выразны антыбальшавіцкі характар:

"Я, Жаўнер, Беларускай Краёвай Абароны, прысягаю на Ўсемагутнага Бога і жаўнерскі гонар, што буду верна служыць свайму Беларускаму Народу, сумленна і прыкладна выконваць усе загады сваіх камандзіраў і начальнікаў.

Я прысягаю, што побач з нямецкім жаўнерам, не выпушчу зброі да тых пор, пакуль не будзе ўстаноўлены поўны спакой і бяспека ў нашых селах і гарадах, пакуль не будзе знішчаны на нашай зямлі апошні вораг Беларускага Народу.

Я прысягаю, што хутчэй згіну смерцю героя, чымся дапушчу, каб мая жонка і дзеці, бацькі і сестры, браты і ўвесь Беларускі народ зноў цярпелі бальшавіцкі здзек і няволю.

Калі-ж з сваей слабасці ці злога намеру я парушу гэтую прысягу, то няхай пакарае мяне Бог ганебнай смерцю здрадніка свайго народу і Бацькаўшчыны."

Пасля прысягі адбыўся парад. Прысяга не была праведзена ў некаторых батальёнах па прычыне працэсу фарміравання іх. Першы курс перападрыхтоўкі афіцэраў і падафіцэраў скончыўся ў палове сакавіка. 50 афіцэраў і 200 падафіцэраў здавалі экзамен у прысутнасці фон Готберга. У канцы красавіка 1944 г. быў адкрыты другі курс. Трэці курс адбыўся яшчэ ў чэрвені 1944 года, калі ў Мінск з'ехалася каля 280 кандыдатаў у афіцэрскую школу (працавала з 15 чэрвеня 1944 г.). Прадугледжваўся 6-ці месячны курс падрыхтоўкі, пасля чаго маладым афіцэрам надавалася б афіцэрскае званне. Але, пры набліжэнні савецкіх войск 29 чэрвеня афіцэрская школа пешым маршам накіравалася ў Вільню. У Вільні яны трапілі пад савецкую бамбежку, у выніку якой загінула 6 чалавек. У Вільні афіцэрская школа была пасаджана на цягнік і ў канцы ліпеня перададзена да брыгады Зіглінга.

У гэтых умовах у акупаваным Мінску 27 чэрвеня 1944 г., за 6 дзён да вызвалення горада савецкімі войскамі, быў скліканы II Усебеларускі кангрэс. Кангрэс абвясціў сябе "паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа" і выказаўся за адзяленне Беларусі ад СССР. Але спроба стварэння беларускай дзяржаўнасці з дапамогай акупантаў не мела рэальнасці. Калі ў час работы кангрэса стала вядома, што Чырвоная Армія зрабіла прарыў нямецкіх войск і імкліва рухаецца на Мінск, СС выдзяліў спецыяльны цягнік для эвакуацыі сваіх памагатых і членаў іх сем'яў.

22 чэрвеня 1944 г. пачалося агульнае наступенне Чырвонай Арміі на ўсім Беларускім фронце. Адчуваючы ў БКА рэальную нябеспеку ва ўплыве на насельніцтва, польскія і савецкія партызаны нападалі на гарнізоны БКА, уступалі з імі ў сутычкі. Перад салдатамі БКА паўстала пытанне выбару - адступаць з немцамі ці заставацца на Беларусі? Цяжкія страты, якія неслі батальёны ад партызан, адмоўна паўплывалі на маральны стан салдат БКА. Парушыўшых дысцыпліну накіроўвалі ў штрафныя роты, дзе было цяжка застацца ў жывых. Гэта яшчэ больш зніжала дысцыпліну. З другой паловы красавіка, з-за несаблюдзення санітарных норм, у БКА пачаўся тыф. Трэба адзначыць і тое, што пад уплывам партызанскай прапаганды некаторыя часці БКА пераходзілі на бок партызан. З-за таго, што мабілізацыя была прымусовай, большасць прызыўнікоў не адчувала маральнай адказнасці за сваю службу. Гэтыя людзі ведалі, што іх будуць выкарыстоўваць супраць партызан і не іх віна, што не хапіла часу, каб даць ім зброю. Большай частцы прызваных давялося вярнуцца да дому, а ваяваць пайшлі нямногія. Эвакуацыя батальёнаў БКА не толькі не праводзілася, але і не планавалася. У хаосе адступлення салдаты апынуліся зусім пазбаўленымі кіраўніцтва, сувязь паміж штабам БКА і многімі батальёнамі была цалкам згублена. Частка аддзелаў прыняла бой з передавымі часцямі савецкіх войскаў, частка была распушчана сваімі камандзірамі, частка здолела адступіць з арміяй Вермахта самастойна. За самы кароткі час БКА на тэрыторыі Беларусі перастала існаваць, і толькі невялічкая частка салдат адышла на Захад.

Рэшткі салдат увайшлі ў I кадравы батальён БКА ў Берліне, які разам з прызыўнікамі-беларусамі з заводаў Германіі быў перакінуты на фронт пад Монтэ-Касіна і дзейнічаў супраць II Польскага корпуса генерала

В. Андэрса. Сфарміраваная з БКА, рускіх і украінскіх фарміраванняў 30-я дывізія прымала ўдзел у баях у Італіі, частка дывізіі прымала актыўны ўдзел у падаўленні Варшаўскага паўстання ў жніўні 1944 г. Потым дывізія, якая лічылася кадравым антыпартызанскім злучэннем, была перакінута ў Францыю ў раёны найбольшай канцэнтрацыі ўнутраных сіл Супраціўлення [6]. Р. Астроўскі, разумеючы гібельнасць барацьбы слаба падрыхтаванай дывізіі супраць войск саюзнікаў, робіць усе, каб пазбегнуць прамых сутыкненняў з войскамі антыгітлераўскай кааліцыі. Ён дабіваецца ў Гімлера таго, каб з дывізіі сфарміравалі штурмавую брыгаду "Беларусь" Зілінга. Але салдаты БКА СС "Беларусь" не карысталіся даверам камандавання Вермахта, іх не пасылалі на Усходні фронт. Не паспеўшы скончыць падрыхтоўку, брыгада была кінута супраць наступаючай III арміі Джоржа Патона. У красавіку і маі 1945 г., як і большасць фарміраванняў, часці БКА здаваліся ў палон амерыканцам і англічанам, ведаючы, што на радзіме ўсіх чакае толькі пакаранне. Толькі нязначнай частцы брыгады ўдалося застацца ў жывых, а члены Беларускай Цэнтральнай Рады прадоўжылі сваю работу на чале з прэзідэнтам Р. Астроўскім ажно да 1960-х г. ў ЗША у якасці палітычных эмігрантаў.

Як бачым, тыя некалькі тысяч жаўнераў, якія былі мабілізаваны ў БКА прымусова і пры першай магчымасці перабягалі да партызан, не адчувалі адказнасці, жадання змагацца за эфімерныя ідэі, але ва ўмовах сталінскага рэжыму сапраўды не змаглі б апраўдацца. Колькасць гэтых зломаных вайной лёсаў, нявольных пешак у руках калабарацыі падлічыць немагчыма. Негатыўнае ўражанне ад прафашысцкай арыентацыі БКА наўрад ці перастане суправаджаць яе гісторыю. Фактычна дзейнасцю БКА кіравалі немцы. Пасля вайны яе намінальны камандзір - Кушаль прызнаваў, што "немцы зусім не мелі намеру дазволіць беларусам стварыць нейкую беларускую збройную сілу, ім патрэбны былі толькі людзі, якіх беларусы павінны ім даць, а кіраваць людзьмі меліся яны самі без нашай дапамогі". Няма больш цяжкага злачынства, чым пайсці на службу да ворага і падняць зброю на свой народ. Таму лічу, што Беларускую Краёвую Абарону нельга лічыць нацыянальнымі ўзброенымі сіламі Беларусі.

Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2 / Пад рэдакцыяй Я.К. Новіка. Г.С. Марцуля. - Мн., 1998. - С. 233-244.
2. Гелагаеў Алесь. Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў часе другой сусьветнай вайны". - Мн., 2002.
3. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сёньня. - Мн., 1993. Найдзюк Яз. Беларусь учора і сёння. - Мінск, 1943.
4. Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. - Мн., 1995. - С. 480-481.
5. Кушаль Ф. Спробы стварэння Беларускага войска. - Мн., 1999. Па рукапісу "Спробы арганізацыі Беларускага войска пры нямецкай акупацыі Беларусі".
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. - Мн., 1993 / арт "Астроўскі", Беларуская Краевая Абарона".
7. "За дзяржаўную незалежнасць Беларусі" / Дакументы і матэрыялы, сабраныя й падрыхтаваныя для публікацыі І. Касяком, прагледжаныя і адрэгаваныя для друку камісіяй БЦР пад кіраўніцтвам праф. Р. Астроўскага. - Лондан: Выданне БЦР, 1960. - 197 с.